Ня бойся!

Інфармацыйная культурна-грамадская газета Гарадоччыны

# ГАСЦІНЕЦ

№ 10 (107), ЧЭРВЕНЬ 2010 ГОДА

http://haradok.belarda.org - сайт твайго ГАРАДКА

**Цытата нумара:**

“Дэмакратычныя выбары ва ўмовах дыктатуры немагчымыя...”

**Васіль Быкаў.**

# “ВЕРШЫ” БЫКАВА

Чэрвень для беларусаў з’яўляецца месяцам Васіля Быкава. Менавіта ў чэрвені нарадзіўся наш славуты пісьменнік, меннавіта ў чэрвені ён пайшоў у лепшы свет. Быкаў пакінуў нам вялікую спадчыну твораў і думак, якія апярэдзілі наш час, наша грамадства на дзесяцігодзі. Спадчына нашага земляка такая вялікая, што яе існуючыя улады не могуць ігнараваць, каб не выглядаць канчатковымі дзікунамі перад цывілізаваным светам. Але сёняшняя ўлада лічыць патрэбным для сябе вучыцца на “вершах” Быкава. Так аднойчы выказаўся той, які прызначае сябе каторы тэрмін запар кіраўніком краіны. А такія “вялікія думкі” для нашых чыноўнікаў з’яўляюцца непасрэдным указаннем да дзеянняў. Дзеянняў, якія паказвалі б аддānасць чыноўнікаў свайму кіраўніку. Дзеянні, якія пры сваёй недарэчнасці, адпавядалі б указанням зверху.

І вось, другі год запар, мясцовыя улады ладзяць на Ушаччыне свята паэзіі з нагоды нараджэння Васіля Быкава і іншых славутых творцаў края, якія праславіліся паэтычнымі радкамі. Такі святочны мікст – Свята паэзіі празаіка і паэтаў – могуць стварыць толькі чыноўнікі прызначаныя зверху, якія імкнуцца трымаць нос па ветру. На здаровы сэнс, не жадаеце адзначаць дзень народзінаў славутага сына Беларусі – не адзначайце. Грамадзяне Беларусі і без вашых указанняў будуць шанаваць дзень народзінаў вялікага пісьменніка, патрыёта Бацькаўшчыны. Будуць шанаваць па клічу сэрца, а не ўказанню зверху. Ды і грамадскія ініцыятывы зараз на Беларусі існуюць паралельна дзеючаму рэжыму. Рэжым сам па сябе вызначае накірункі руху, а незалежнае грамадства ідзе сваім пакручастым шляхам.

Незалежнае грамадства шануе ісціну, імкнецца накіраваць краіну па цывілізаванаму гасцінцу. І на гэтым гасцінцы празаік Быкаў ніколі не пісаў вершы. Ды і Скарына ніколі не мог быць у Піцеры, бо ў гады жыцця Францішка на месцы гэтага горада была дрыгва і вада. І за недакладнасцю выказванняў кіраўніка краіны стаіць імкненне паказаць “недарэчнасць” беларускай літаратуры, “недаканаласць” нашых беларускіх творцаў. Але нашы славутыя дзеячы шануюцца сярод культурных народаў і так. І ёсць такое жаданне, каб першы кіраўнік краіны пасталеў, а разам з ім пасталелі і яго чыноўнікі,якія павінны служыць народу, а не навязваць свой не лепшы выбар. Або святаў, або чарговых “дэпутатаў”, або чарговы тэрмін кіраўніка. Бо такія “жаданні” не маюць нічога агульнага з дэмакратычным развіццём краіны.

**Леанід Гаравы.**

# Крадзёж раскрыты хутка

Не прайшло і 10 гадзін, як супрацоўнікі Гарадоцкага РАУС знайшлі скрадзены электракабель.

Раніцай 12 чэрвеня ў Гарадоцкі РАУС звярнуўся грамадзянін К., які будуе свой дом у Гарадку, з заявай аб тым, што ў яго скралі электракабель. Супрацоўнікі Гарадоцкага РАУС хутка знайшлі 45 м электракабеля ў доме непрацуючага 38-гадовага гарадчаніна, які раней быў асуджаны за крадзёж. Праверку факта крадзяжу праводзіў аддзел крымінальнага вышуку якім вызначана, што азначаны кабель каля 0 гадзін 30 хвілін непрацуючы выкраў з двара дома, які будуецца і належыць рабочаму, 1959 года нараджэння. 18 чэрвеня ўзбуджаная крымінальная справа па арт. 205 ч. 2 КК РБ.

**Паводле сайта УУС Віцебскага аблвыканкама.**

# Павышаная камфортнасць жылля амаль адсутнічае

Толькі пяць дамоў Гарадоччыны прызнаны дамамі павышанай камфортнасці

Змены, унесеныя 28 красавіка ў Пастанову Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, увялі паняцце жылля павышанай камфортнасці. Уладальнікі дадзенага жылля, а гэта катэджы, дамы з агульнай плошчай больш 200 кв. м., з 1 чэрвеня павінны аплочваць тэхнічнае абслугоўванне і ацяпленне па поўнаму сябекошту дадзеных паслуг у камунальных службах.

Да сядзібных жылых дамоў павышанай камфортнасці адносяцца дамы з агульнай плошчай жылых памяшканняў больш за 200 квадратных метраў, забяспечаныя гаспадарча-пітным і гарачым водазабеспячэннем, каналізацыяй, ацяпленнем і вентыляцыяй і г. д., размешчаныя ў Мінску і прыгарадзе, абласных гарадах і прылеглых да іх адміністрацыйных раёнах, раённых цэнтрах. Па папярэдніх ацэнках, у цяперашні час у Беларусі пад дадзеныя параметры падпадае каля 10 адсоткаў ад усіх сядзібных жылых дамоў. Такое тлумачэнне даюць у Міністэрстве жыллёва-камунальнай гаспадаркі. А Указ кіраўніка краіны інакш трактуе жыллё павышанай камфортнасці: да жылых дамоў павышанай камфортнасці адносяцца жылыя дамы з адным з наступных крытэрыяў: альбо размяшчаецца ў першай эканоміка-планіровачнай зоне, альбо якія будуюцца з прымяненнем індывідуальных архітэктурных, планіровачных і канструктыўных рашэнняў (вышыня хоць бы аднаго жылога паверха перавышае 3 метры, каэфіцыент адносіны агульнай плошчы да жылой хаця б адной кватэры, акрамя аднапакаёвых, 2 і больш, агульная плошча хоць бы адной кватэры складае больш за 140 кв. метраў). Гэта з Указа «Аб канфіскацыі і прадастаўленні зямельных участкаў» ад 27 снежня 2007 г. № 667.

Рэальна жа зараз грамадзяне аплочваюць толькі 32% фактычнага кошту камунальных паслуг. Ва ўмовах крызісу дзяржава шукае магчымасці знайсці дадатковыя крыніцы пакрыцця затрат на камунальнае абслугоўванне. Рэалізацыя дадзенага рашэнне па разліках кіраўніцтва Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі дазволіць зэканоміць 10 мільярдаў рублёў у рэспубліканскім бюджэце.

Гарадоцкі райвыканкам рашэннем ад 31 мая прызнаў дамамі павышанай камфортнасці дамы, якімі валодаюць: Дземьяненка Ігар і Дземьяненка Анатоль, Краснабаева Надзея, Пятроў Валеры, Асіпенка Святлана, Зудава Ліля. Дамы, дадзеных уладальнікаў, маюць плошчу ад 204 кв.м да 351 кв.м.. Відавочна, што ўнёсак гарадакчан у эканомію рэспубліканскага бюджэта будзе мінімальным, але затраты на паслугі па ацяпленню і абслугоўванню для вышэй названых гаспадароў узрастуць, як мінімум у тры разы.

Толькі ці будзе сабрана дадаткова дзесяць мільярдаў у рэспубліканскі бюджэт пакажа час.

**Т. Гаражанка.**

# ГЕНАДЗЬ БУРАЎКІН ПРА ВАСІЛЯ БЫКАВА

Калі стаіш на гэтай зямлі, сапраўды, хацеў бы не хвалявацца, але немагчыма не хвалявацца. Гэты куток даў Быкаву жыццё, а Быкаў даў гэтаму кутку сусветную вядомасць і бессмяротнасць.

Гэта, відаць, самае выдатнае, што можа быць у жыцці чалавека і ў жыцці тых людзей, якія з ім на гэтым вось кавалачку нашай зямлі жылі, працавалі. Можа быць, часам не разумелі адзін аднаго, можа быць часам спрачаліся, але паядналіся назаўсёды. І я, калі прыязджаю сюды, міжволі, калі не фізічна, то ў душы кланяюся гэтай зямлі. Зямлі не надта багатай, зямлі не надта аблашчанай многімі ўладамі, але зямлі сумленнай, зямлі слаўнай, зямлі, якая не аднаго ж Васіля дала. А вы паглядзіце, тут жа быў народжаны і слаўны Пятрусь Броўка, тут жа была народжаная мілая Дуся Лось (Еўдаія Якаўлеўна Лось). Тут жа нарадзіўся выдатны наш паэт Рыгор Барадулін, які недалёка адсюль сядзіць у матчынай хаце зараз, бо не надта добра сябе пачувае і не змог сюды прыехаць. Тут, зусім недалёка, нарадзіўся Сяргей Законнікаў.

Вы ведаеце, я назваў столькі прозвішчаў, і яны настолькі яркія і цікавыя, што іх бы хапіла на цэлую літаратуру. А гэта толькі адзін Ушацкі раён. Толькі вось гэтая зяленая, азёрная, рачная, пясчаная зямля.

Што такое Быкаў, я думаю, мы яшчэ да гэтага часу не ўсвядомілі, хаця мы ўжо падыходзім да ўсведамлення яго ролі не толькі ў літаратуры, яго ролі ў духоўным, у культурным жыцці Беларусі. Яго называюць цяпер самымі гучнымі імёнамі, часам, можа быць, не надта задумваючыся, што стаіць за гэтымі словамі. Але шчасце ў тым, што Быкаў такая асоба, што гэтыя перабольшванні ніколькі яго не пакрыўдзяць, і ніколькі, так сказаць, у нечым ацэняць несправядліва.

Прарок? Так, прарок. І той, хто не чытаў, а толькі яшчэ прачытае ягоныя прыпавесці апошняга часу, апошніх гадоў яго жыцця, ён зразумее, як гэта сапраўды дакладна сказана – прарок.

Сумленне нацыі? Так, сумленне нацыі. Той, хто прачытае яго публіцыстыку, гарачую, кіпучую, гадоў Адраджэння, ён зразумее: так, гэта -- сумленне нацыі.

Вялікі пісьменнік? Так, бо ўвесь свет яго чытае. Ён перакладзены практычна на ўсе развітыя мовы свету.

Вялікі беларус? Так, Вялікі беларус. Бо ніхто, на мой погляд, так не выявіў памастакоўску геніяльна беларускі характар, як ён гэта зрабіў у вобразах Сцепаніды і Петрака ў незабыўным “Знаку бяды”.

Гэта шчасце, якое яшчэ не ўсе ацанілі і якое, я не сумняваюся ні на хвілінку, ацэняць.

Дык вось, для таго, каб патомкі не папракалі нас, што мы ў свой час нечага не зразумелі, што мы ў свой час нечаму не паверылі, я ў гэтыя быкаўскія дні на гэтай быкаўскай зямлі заўсёды хачу сказаць: “Дарагі Васіль! Цябе няма тут побач з намі, але, кажуць, што духоўная сувязь з небам, з Богам і з такімі людзьмі, як ты, яна ўсё роўна існуе. Дык вось, дарагі Васіль! Дзякуй табе за тое, што ты зрабіў, даруй нам, за тое, што пры жыцці мы, магчыма, часам цябе не абаранілі. Часам, можа быць, не далі той ласкі, якой ты заслугоўваў, а мы неяк па-сціпламу, паўшацку, па-беларуску ўсё гэта прыхавалі да лепшага часу, а лепшага часу не так лёгка дачакацца. Дзякуй, дарагі Васіль, за ўсё, што ты даў, за тое што ты нас далучыў да той бессмяротнасці, да якой вядзе твой магутны талент.”

Так атрымалася, што я ў свой час не раз пісаў вершы пра Васіля. Я не хачу чытаць сёння тут верш, напісаны пасля яго смерці. Вы бачыце, як гісторыя, як лёс, як Бог распарадзіліся, што ў яго амаль супадае дзень нараджэння і дзень смерці. Тым больш, што дзень смерці -- гэта чорны дзень, дзень пачатку страшэннай жахлівай вайны з фашызмам.

Я вам прачытаю верш, які я напісаў да яго юбілею, калі ён быў яшчэ жывы. І мне радасна, што ён яшчэ паспеў яго пачуць, і, здаецца, прыняў яго не толькі вухам, але і сэрцам.

*Усё не затухае боль*
*Здаецца, мірныя часы*
*У Беларусі незалежнай.*
*Няма нейтральнай паласы*
*І акупацыі замежнай.*

*А ўсё не затухае бой,*
*І ў ранах боль не дагарае.*
*І над тваёю галавой*
*Зноў кружыць крумкачова зграя.*

*І батарэя прыбышоў*
*Б’е па табе прамой наводкай,*
*І той, хто з чорнаю душой,*
*І той, хто з луджанаю глоткай.*

*Ах, як карціць ім, бачыць Бог,*
*Каб да зямлі цябе прыгнулі*
*І неўсвядомлены спалох,*
*І ўладай пушчаныя кулі.*

*Іх злосць бярэ, што ты дажыў*
*Да пераможнай майскай кроплі*
*Не ў генеральскім бліндажы,*
*А ў цесным жвірыстым акопе.*

*Дык боль і роспач перасіль*
*І ў безаглядным парыванні*
*Устань на поўны рост, Васіль,*
*І ворагам хай страшна стане!*

# “ГАСЦІНЕЦ” У ІНТЭРНЭЦЕ

**У сувязі з праблемай размяшчэння газеты “Гасцінец” на партале http://haradok.belarda.org/ наша газета стала будзе размяшчацца на партале http://kamunikat.org/ , дзе зацікаўленыя грамадзяне могуць яе спампаваць са старонкі: http://kamunikat.org/hasciniec.html, што у каталагу “Пэрыёдыка” для далейшага выкарыстання.**

Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка
камунікат
www.kamunikat.org

# АБ’ЯВА

- ***Каб атрымліваць кожны нумар газеты «Гасцінец» паведаміце рэдакцыі аб гэтым – зрабіце бесплатную падпіску.***
- ***Рэдакцыя “Гасцінец” змяшчае бясплатныя абвесткі чытачоў выдання. Дзеля размяшчэння абвесткі запоўніце купон або патэлефануйце ў рэдакцыю.***
- ***Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатных юрыстаў. Звяртайцеся на адрас: Гарадок, вул. Галіцкага д.16 кв.2 ў кожны аўторак і чацвер з 16 да 18, або на тэлефоны газеты «Гасцінец».***
- ***Жадаючыя атрымаць у карыстанне беларускія кнігі, часопісы або іх набыць звяртайцеся на адрас: Гарадок, вул. Галіцкага д.16 кв.2 ў кожны аўторак і чацвер з 16 да 18, або на тэлефоны газеты «Гасцінец»***
- ***Рэдакцыя запрашае да супрацоўніцтва неабыякавых грамадзян. Вашы навіны, паведамленні – нашая падзяка. Словам, сувенірам.***

# АКТЫВІСТ ПАТРАБУЕ ГУМАННЫХ АДНОСІН ДА ДАМАШНІХ ЖЫВЁЛ

Леанід Гаравы, актывіст Руху «За свабоду!» звярнуўся са зваротам да новага старшыні Гарадоцкага райвыканкама В.М. Муранкова.

У сваім звароце Леанід Гаравы адзначае, што ён 6 мая звярнуўся да дырэктара ГРУП ЖКГ «Гарадок» наконт адлова бадзяжных сабак, якія масава знаходзяцца на вуліцах Гарадка і з'яўляюцца пагрозай для жыцця і здароўя грамадзян. Але дырэктар ГРУП ЖКГ «Гарадок» Я.В. Гурынаў у адказе паведаміў, што адлоў сабак у Гарадоцкім раёне не праводзіцца, а па рашэнню Гарадоцкага райвыканкама з 20 мая па 9 чэрвеня 2010 года ў светлы час сутак будзе праводзіцца адстрэл бадзяжных сабак. Праведзены адстрэл сабак выклікаў негатыўную рэакцыю грамадзян Гарадка, стаў нагодай для публікацыі ў раённай газеце «Гарадоцкі веснік».

Дадзенае становішча сведчыць, што папярэдняе кіраўніцтва Гарадоцкага райвыканкама на працягу амаль дзесяці гадоў ігнаравала Пастанову Савета Міністраў №834 ад 4.06.2001, якой уведзены ў дзеянне «Правілы ўтрымання сабак, катоў, а таксама адлову бадзяжных жывёл у населеных пунктах Рэспублікі Беларусь». Пры гэтым ГРУП ЖКГ «Гарадок» не праводзіла працу па выкананню Пастановы Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі №23 ад 21.12. 2001 наконт працы з бадзяжнымі жывёламі. У выніку на працягу дзеяння дадзеных нарматыўных дакументаў адказныя работнікі райвыканкама выкарыстоўвалі толькі выключную меру барацьбы – адстрэл бадзяжных жывёл, які сведчыць аб не гуманным стаўленні кіраўніцтва Гарадоцкага райвыканкама да дамашніх жывёл у Гарадку.

Да гэтага часу грамадзяне Гарадоччыны не ведаюць якая праца праводзіцца па ўліку дамашніх жывёл і якія яе вынікі: колькі зарэгістравана дамашніх жывёл у Гарадоцкім раёне, якія сродкі атрымаў бюджэт ад рэгістрацыі жывёл і на якія мэты яны выкарыстаны.

Для вырашэння існуючай праблемы актывіст Руху «За свабоду» Леанід Гаравы прапануе:

1. Адкрыць прытулак для бадзяжных жывёл у Гарадку, куды яны павінны змяшчацца пасля адлову, стварыўшы адпаведную брыгаду для адлова бадзяжных жывёл. Гэта брыгада павінна прайсці навучанне сучасным метадам адлову бадзяжных жывёл.
2. Да адкрыцця прытулка для бадзяжных жывёл у Гарадку праводзіць адлоў бадзяжных сабак і катоў з удзелам спецыяльнай брыгады з іншага населенага пункта. Гэта будзе садзейнічаць спыненню практыкі дзікунскага адстрэлу дамашніх жывёл на Гарадоччыне.
3. Штогадова інфармаваць грамадскасць Гарадоцкага раёна аб працы па выкананню Правіл утрымання сабак і катоў у горадзе і сельскай мясцовасці праз раённую газету «Гарадоцкі веснік».

**Л. Антонаў.**

# Фірмовая прадукцыя “Ганна” атрымоўвае еўрапейскі сертыфікат

Пасля 22 чэрвеня будзе вядома ці адпавядае прадукцыя брэнда «Ганна» Віцебскай бройлернай фабрыкі еўрапейскім стандартам якасці.

З 14 чэрвеня на Беларусі працуюць эксперты Еўрапейскай камісіі па ахове здароўя і абароне спажыўцоў дзеля праверкі гатоўнасці Беларусі да паставак прадукцыі птушкагадоўлі на рынкі Еўрапейскага саюза. Эксперты правяраюць якасць прадукцыі Віцебскай бройлернай фабрыкі і агракамбіната «Дзяржынскі» адпаведна еўрапейскіх стандартаў. Менавіта гэтыя вытворцы прадукцыі з мяса птушкі маюць самае сучаснае абсталяванне, якое пакуль не мае аналагаў у краіне. Так Віцебская бройлерная фабрыка за мінулыя гады правяла аўтаматызацыю тэхналагічных працэсаў з дапамогай кампаніі Golden Software of Belarus, Ltd. Маштабныя інвестыцыі ў ERP сістэму на платформе Гедымін вывелі Віцебскую бройлерную ў лідэры не толькі ў краіне, але і сярод аналагічных прадпрыемстваў СНД.

Жыхары Гарадоччыны маюць магчымасць набываць прадукцыю фабрыкі ў фірмовым магазіне «Ганна» ля краязнаўчага музея. Гэтая крама сярод крам Гарадка вылучаецца шырокім і якасным асартыментам прадуктаў харчавання, а таксама высокай культурай абслугоўвання спажыўцоў.

**Т. Гаражанка.**

# ШАНУЙЦЕ РОДНУЮ МОВУ

Канстытуцыя краіны гарантуе раўнапраўнае існаванне дзвюх дзяржаўных моў. Але пасля правядзення сумна вядомага рэферэндума 1995 года з боку дзяржаўных органаў вялася палітыка на абмежаванне сферы ўжывання беларускай мовы. Пры дэкларуемым раўнапраўі моў беларуская мова яшчэ не атрымала неабходнага рэальнага статуса дзяржаўнай мовы. Прызначаныя дэпутаты Палаты прадстаўнікоў за 14 год свайго існавання не выпрацавалі неабходных прававых норм, каб беларускамоўныя грамадзяне не зведалі абмежаванняў у карыстанні роднай мовай.

Гэта ў еўрапейскіх краінах чыноўнікі ведаюць дзве-тры еўрапейскія мовы і ў абавязковым парадку здаюць іспыты на веданне дзвюх дзяржаўных моў. І гэта з'яўляецца агульнапрызнаным стандартам моўнай палітыкі. Інакш адбываецца на Беларусі. Чыноўнік не можа сказаць ніводнага сказу на беларускай мове, не можа размаўляць з беларускамоўным грамадзянінам, а яго начальніца кажа, што ён ведае беларускую мову. Або начальніца, бароньчы “цнатлівую” аднамоўнасць дзяржаўнага чыноўніка пачынае заяўляць, што наогул чыноўнік не абавязаны даваць адказы на дзяржаўнай беларускай мове.

Гэта асабліва яскрава праявілася ў Гарадку пад час выбарчай кампаніі, калі старшыні камісій і В. Грыбанаў, і Н. Бераснева забыліся на дзяржаўную беларускую мову і пачалі пісаць “адсебяціну” па-расейску. Зразумела, што нормы выбарчага заканадаўства яны парушалі па-расейску. І калі на гэта ўказвалася мной на дзяржаўнай беларускай мове, то да роднай беларускай мовы, яны не маглі “снизойти”.

У перапісцы з Гарадоцкім райвыканкамам апошнім сталі лісты адказаў са смешанымі мовамі, калі старшыня райвыканкама палову ліста пісаў па-расейску, а другую – па-беларуску ды яшчэ адказ ад ідэалагічнага аддзела аблвыканкама па-беларуску. У гэтай сітуацыі магчыма было падаць заяву ў суд на неправамоцныя дзеянні намесніцы Гарадоцкага райвыканкама Буруновай Н., якая ігнаравала відавочныя факты парушэння моўнага заканадаўства дзяржаўнымі чыноўнікамі, але пашкадаваў на гэта час. Хай ігнараванне роднай мовы застанецца на сумленне гэтых чыноўнікаў, якія атрымліваюць грошы ад беларускіх падаткаплацельшчыкаў. Хаця гэтага яны магчыма і не разумеюць. Як не разумеюць і запавет нашага класіка: “Шануйце беларускую мову, каб не памерці”.

**Л. Гаравы.**

# СУПРАЦОЎНІКІ “СІРЫУС-СТБ” ПАД СЛЕДСТВАМ

Звяртанне да паслугаў ЧУП “Сірыус-СТБ” па рамонту мабільных тэлефонаў прывяло да знікнення мабільных тэлефонаў

Шырокі распаўсюд мабільнай сувязі ў краіне спарадзіў адпаведную хвалю злачынстваў з мабільнымі тэлефонамі. Зводкі міліцэйскіх рапартаў запоўнены інфармацыяй аб крадзяжах мабільных тэлефонаў пры распіцці спіртных напояў або з дамоў і кватэр уладальнікаў мабільных тэлефонаў. А зараз следчыя Кастрычніцкага РАУС г. Віцебска даследуюць знікненне мабільных тэлефонаў у ЧУП“Сірыус-СТБ”. Грамадзяне з Віцебска, Гарадка, Барані, Бешанковіцкага раёна заявілі аб тым, што з дадзенай фірмы не магчыма назад атрымаць здадзеныя на рамонт тэлефоны. Грамадзяне здавалі мабільныя тэлефоны ў пункт прыёма, які арэндуецца ЧУП “Сірыус-СТБ” у гандлёвым цэнтры “Эвіком” у 15 радзе на 15 месце на пачатку красавіка. Але тэлефоны рамонтная арганізацыя не вярнула ні праз 14 дзён, як патрабуе заканадаўства, ні праз 21 дзень, як абяцала арганізацыя, ні праз паўтара месяца, калі закончыліся ўсе тэрміны.

Заканадаўства аб абароне правоў спажыўцоў гарантуе вяртанне новага тэлефона адпаведнай маркі па згодзе выканаўцы, або вяртанне двукратнага кошту тэлефона з кампенсацыяй затрат, маральнай шкоды праз суд. Пацярпелыя грамадзяне пачалі звяртацца ў суд з прэтэнзіямі да ЧУП“Сірыус-СТБ”, а следчыя Кастрычніцкага РАУС г. Віцебска працягваюць следства па факту знікнення чатырох мабільных тэлефонаў з ЧУП“Сірыус-СТБ”.

Спажыўцам жа цяпер даводзіцца быць асцярожным пры звароце па рамонту мабільных тэлефонаў. Трэба разуімець, што калі фірма ўстанаўлівае тэрмін выканання заказу больш 14 дзён, то яна парушае дзеючае заканадаўства.

**Т. Гаражанка.**

# ТРУХЛЯВЫЯ ДАМЫ ЛІКВІДАВАЛІ

***На Гарадоччыне за чатыры гады ліквідавалі ўсе трухлявыя дамы ў сельскай мясцовасці .***

Гарадоччына вылучаецца сярод іншых мясцін Беларусі сваёй малай шчыльнасцю насельніцтва – самай нізкай у Еўропе. На трох тысячах квадратных кіламетраў размешчана 354 населеных пункта, дзе пражывае каля 28 тысяч насельніцтва. Пры гэтым у 39 вёсках ніхто не пражывае, у 22 толькі па аднаму жыхару, а ў 172 пражывае не больш 10 чалавек. І з кожным годам насельніцтва скарачаецца катастрафічнымі тэмпамі.

А калі народу становіцца ўсё менш, то і адпаведна дагледаць дамы няма каму і яны прыходзяць у запусценне. Пасля Указа кіраўніка краіны ў 2006 годзе на Гарадоччыне было абследавана каля 360 населеных пунктаў і выяўлена 812 пустуючых і 560 трухлявых дамоў. Праца па выяўленню гаспадароў пустуючых дамоў прывяла да з'яўлення гаспадароў у 438 хат. Далейшая праца з выяўленнем гаспадароў прывяла да таго, што пустуючымі ў раёне засталося толькі 208 хат.

Адначасова з выяўленнем гаспадароў прыступілі і да зносу трухлявых дамоў. Найбольш актыўна дадзенная праца вялася ў Віраўлянскім, Межанскім, Даўгапольскім, Руднянскім і Першамайскім сельсаветах. Менавіта ў гэтых сельсаветах, за выключэннем Першамайскага, была вялікая колькасць трухлявых дамоў. Па стану на 1 мая гэтага года сельсаветы адрпапартавалі аб тым, што ўсе трухлявыя дамы ліквідаваны. Але ыццё не стаіць на месцы і праз пэўны час з'явяцца дамы, якія будуць мець лядзяшчы выгляд. І зноў трэба будзе знасіць старыя дамы.

**Л. Антонаў.**

## НАША БІБЛІЯТЭКА




## ВАСІЛЬ БЫКАЎ “ДОЎГАЯ ДАРОГА ДАДОМУ” ГА БТ “КНІГА”, МІНСК, 2002

Гэтая кніга — успаміны народнага пісьменьніка Беларусі Васіля Быкава пра асабіста перажытае амаль за 70 гадоў ягонага багатага на падзеі жыцьця. У цікавай аўтарскай манэры вядомы пісьменьнік распавядае пра найбольш яркія старонкі сваёй біяграфіі, дае ацэнку грамадзка-палітычным і культурным працэсам, што адбываліся ў Беларусі на ягоных вачах. В. Быкаў прапануе досьвед культурнага дзеяча, знакамітага пісьменьніка, выказвае думкі аносна будучага разьвіцьця краіны.

Кніга ўспамінаў Васіля Быкава дазваляе адчуць жыццёвы шлях вялікага БЕЛАРУСА. Менавіта Васіль Быкаў стаў маральным аўтарытэтам для беларусаў, якія адрадзілі сваю дзяржаву на абломках імперскага Савецкага Саюза. Яго парады і прароцтвы шчэ не да канца асэнсаваны ў грамадстве, каб стаць рэальнай сілай у барацьбе за лепшую долю беларусаў.

У кароткім прадмоўі Васіль Быкаў папярэджвае чытача, што “гэтая кніга ¬¬¬– твор вельмі інтымны, суб'ектыўны, аднабаковы, якім, зрэшты, ці не заўжды зьяўляецца мемуар, успамін, сьведчанне. Думаецца, у тым ягоная сіла, але і адначасова і слабасьць...”. І сапраўды, на больш чым пяцістах старонках паўстае жыццё Васіля Ўладзіміравіча: ад самых малых гадоў у Бычках на Ўшаччыне да часоў стварэння беларускага ПЭНцэнтра. Кніга карысна кожнаму беларусу, каб судакрануцца з жыццёвым шляхам нашага славутага пісьменніка. Быкаў першым напісаў праўду пра вайну. Той жа праўдаў дыхаюць старонкі яго кнігі ўспамінаў.

Дадзеную кнігу магчыма замовіць для чытання ў рэдакцыі выдання.

**Л. Антонаў.**

# ВТОРАЯ ГАЗОВАЯ: В ЧЕМ ПРИЧИНА?

***Нынешняя газовая война имеет явный политический контекст и может не прекратиться даже после всех взаимных выплат, пишет газета «КоммерсантЪ». Своими действиями Россия пытается добиться уступок не в экономической плоскости, а в ключевых политических вопросах - наподобие Таможенного союза, считают эксперты.***

На политическую, а не экономическую причину указывает, в первую очередь, весьма небольшая сумма долга (менее 200 миллионов долларов), из-за которой разгорелся весь сыр-бор. Для сравнения: когда в начале года Москва конфликтовала с Минском по поводу пошлин на нефть, цена вопроса составляла около двух миллиардов. Газовая же задолженность сейчас явно используется Кремлем как предлог для закручивания вентиля, говорит большинство экспертов.

Политическую подоплеку нынешней «газовой войны» подтверждают и источники «Коммерсанта» в правительстве и МИД РФ. «Сумма долга небольшая. Но в кризис и 200 миллионов -- деньги. А главное -- надо заставить наших партнеров исполнять взятые на себя обязательства. Это касается не только газа», - говорит собеседник «Коммерсанта» в правительстве.

В качестве основной причины эксперты в первую очередь указывают на последнее манкирование Минском развитием Таможенного союза. Так, Беларусь демонстративно отказалась посылать своего премьера Сергея Сидорского в Санкт-Петербург на подписание документов о создании единой таможенной территории. Демарш Минска поставил под сомнение планы Москвы завершить создание трехстороннего союза к 1 июля.

Кроме того, в Кремле не могут забыть обещания Александра Лукашенко признать Абхазию и Южную Осетию. Белорусский парламент не начал обсуждать этот вопрос до сих пор, и в Москве возникают вопросы, почему весьма отдаленная Никарагуа может признать независимость новоиспеченных республик, а ближайший союзник - нет.

Есть в конфликте и личностный момент, отмечает издание - с начала года белорусский президент отметился жесткими заявлениями в адрес российского премьера Владимира Путина и министра финансов, вице-премьера Алексея Кудрина.

Таким образом, путем перекрытия газа Москва пытается сделать Минск чуть более сговорчивым в вопросах, имеющих для нее принципиальное значение. При этом, отмечают эксперты, время для «газовой атаки» было выбрано неслучайно - научившись на ошибках с Украиной, Газпром перекрыл трубу летом, чтобы минимально побеспокоить европейских потребителей.

В итоге основной удар понесет, скорее всего, белорусская экономика - без российского газа многие предприятия могут встать. Эксперты не исключают, что именно этого эффекта и добивалась Москва.

Учитывая глубинные причины конфликта, эксперты убеждены, что война между Москвой и Минском в той или иной форме будет продолжаться даже после уплаты Белоруссией долга. Издание приводит мнение замгендиректора Центра политических технологий Алексея Макаркина - он уверен, что конфликт будет идти до тех пор, пока Минск не сделает уступки хотя бы по самым острым вопросам, и прежде всего - по Таможенному союзу.

# Слабый тоталитаризм

***Можно ли назвать российско-белорусский конфликт вокруг цены на газпромовский газ для Беларуси международным?***

Российский министр иностранных дел Сергей Лавров высказался в том духе, что этот конфликт находится вне компетенции МИД РФ и им должны заниматься энергетические компании двух государств. С другой стороны, глава «Газпрома» Алексей Миллер, объявляя о сокращении с 10 утра 21 июня поставок российского газа в Беларусь на 10 процентов, выполнил ультиматум российского президента. Как известно, это Дмитрий Медведев установил срок в пять дней для того, чтобы белорусская сторона «определилась с оплатой» долга в 192 миллиона долларов за поставленный в 2010 году газ. Еще раньше, 19 июня, Миллер высказался опять же в первую очередь как «государев человек», а не как глава частной компании: «Президент все сказал. Как он сказал, так и будет, так и сделаем».

Выходит, газовый конфликт одновременно и частный, и государственный. Спор хозяйствующих субъектов, в котором обе стороны почему-то руководствуются решениями первых лиц обоих государств. Любому экономисту известно, что ничем хорошим такие споры не кончаются, поскольку ведутся они в той «серой зоне» между политикой и экономикой, где законы бессильны перед произволом отдельных лиц.

Такой неэффективный метод разбирательства выбрала не Россия. В стране есть масса частных компаний, включая весьма крупные, которые вполне самостоятельно ведут экономическую деятельность за рубежом. Выигрывают и проигрывают в зависимости от собственной эффективности и конъюнктуры мирового рынка. Но что прикажете делать, когда на противоположном конце газовой трубы - государство, чья экономика фактически управляется одним человеком, желающим держать в руках все нити управления? Какие могут быть «правила игры», если твой партнер привык сам устанавливать эти правила, по которым всегда и все выигрывает, включая все выборы, начиная с 1994 года?

Остается одно - и с российской стороны сосредоточить все решения в одном центре, подходить к этому спору хозяйствующих субъектов по-государственному. Но и тут возникает проблема - а с кем Россия ведет переговоры?

В отношениях с Россией Лукашенко - это даже не двуликий Янус, а вечно перевоплощающийся Протей (был такой мифический персонаж, принимавший ту форму, которая была ему в данный момент наиболее выгодна). Когда речь идет о получении кредитов от России или ЕС, он - глава абсолютно независимого суверенного государства, которое вольно распоряжаться полученными деньгами так, как хочет. Когда же разговор заходит о ценах на российские газ и нефть для Беларуси он оборачивается президентом страны - члена Таможенного Союза и «союзного государства» России и Беларуси (СГРБ), которая имеет якобы право получать нефть и газ беспошлинно, да еще и по внутрироссийским ценам. Когда на повестке дня вопрос об обязанностях Беларуси в рамках вышеупомянутых интеграционных структур, Лукашенко - холодный дипломат и глава суверенного государства, не намеренного, скажем, помогать странам Средней Азии строить гидроэлектростанции (были такие проекты в рамках ЕврАзЭС). Но когда нужно свалить вину за беды собственной страны на Россию, якобы отказавшую в «братской помощи», дипломатический язык куда-то исчезает, сменяясь задушевно-обвинительным. Тут уж, как писал Есенин, «к черту я снимаю свой костюм английский». Вот несколько свежих цитат.

«Экономика Беларуси сегодня фактически работает на российскую экономику. И не надо тут впихивать, что мы на дурняк хотим прожить! Нет, мы очень большую пользу приносим России, начиная от производства и заканчивая обороной и другими вопросами… Нельзя так вести себя в отношении Беларуси: другим понижая цены на газ или фиксируя их, а нам повышая. Много на этом россияне и «Газпром» не наживутся, а вот потерять могут многое»,- цитирует белорусского правителя агентство БелТА.

Как видите, язык отнюдь не дипломатический. И пропагандистский прием, если приглядеться, из разряда запрещенных для настоящих политиков - недоговаривать, через упрощение представлять ситуацию в выгодном для себя свете.

Россия понижает цену на газ для стран Евросоюза не из нелюбви к Беларуси, а потому что эти цены сегодня - в несколько раз выше, чем для белорусов. Разрыв этот надо сокращать, вот Россия и повысила с начала 2010 года цену для Минска с $ 150 до $174, параллельно снижая ее для стран ЕС, где из-за кризиса цены на газ падают. Но Лукашенко с января притворялся, что ему ничего не известно об этом повышении, а теперь трубит о нем как о предательском ударе в спину со стороны союзного государства. Оказывается Минск, получив в прошлом году от



Москвы кредиты в миллиарды долларов, не может вернуть $192 млн. накопившегося долга.

Так же, увы, вел себя Лукашенко и при предыдущих повышениях цен на газ - в 2005 и в 2008 годах. Сначала - отсутствие реакции на сообщение о повышении цены, потом - крики возмущения. Воистину, человек - это стиль: всякий раз параллельно со стонами идет тонкая игра с продажей акций «Белтрансгаза» Газпрому. То они стоят 2,5 млрд. долларов, то 5 миллиардов. То Газпрому продают 50 процентов акций «Белтрансгаза», то 49 процентов, то 50 процентов минус одна акция. Цель со стороны Лукашенко одна: получить от партнера и кредиты, и субсидированный газ, расплатившись разговорами о «славянском единстве».

Славянское единство белорусского и российского народов - это не миф и не фантом. Но не надо прикрывать этими высокими словами не самую честную политическую игру. По подписанным Лукашенко документам, на единую валюту наши страны должны были перейти еще в 2005 году, давно уже должен был быть принят и Конституционный акт, снимающий барьеры между нашими государствами. Но ничего же этого не сделано! Зато о своих правах на субсидированные нефть и газ Лукашенко заявляет чуть ли не еженедельно.

Постепенно становится ясно: авторитарные методы управления государством рано или поздно отрицательно сказываются и на экономике, подрывая доверие партнеров, делая экономическую ситуацию непредсказуемой. Если можно играть краплеными картами на выборах, то почему бы не поиграть ими и на переговорах по газу? Выработка цивилизованных, демократических правил в отношениях между нашими государствами - важнейшая задача. Стиль «ручного управления» как в политике, так и в экономике должен уйти в прошлое.

**Дмитрий Бабич, «РИА Новости».**

# СЕМЬ МЕСТ, ГДЕ СЛЕДОВАЛО БЫ ПОГУЛЯТЬ ЛУКАШЕНКО

После того, как Александр Лукашенко прогулялся по парку Горького и раскритиковал цены на детские развлечения, стоимость выстрела в тире снизилась сразу в два раза. Вот мы и подумали: а хорошо бы главе государства и в дальнейшем совершать променад там, где дорого! В связи с чем предлагаем ему список маршрутов на ближайшее время.

Для начала напомним, что 1 мая Александр Лукашенко посетил парк Горького, где немало был удивлен ценами на аттракционы.

— 500 рублей один раз стрельнуть с воздушки! — изумлялся президент. — Явно кто-то наживается. Монополизм, нет конкуренции. Мы договорились, что в течение месяца несколько тиров будет здесь создано, несколько на других площадках. Чтоб дети приходили, особенно мужики, парни. Им же надо это, они должны учиться.

Сказано — сделано. И вот возле хоккейного катка «Юность» в парке появился новый тир. «Белые двери из стеклопакетов, в помещении еще чувствуется легкий запах краски», восхищалась новым объектом корреспондент «Комсомольской правды в Белоруссии». Но что более отрадно: стоимость одного выстрела в этом заведении обходится в два раза дешевле — всего в 250 рублей.

Как видим, польза таких прогулок президента налицо. В связи с чем хотелось бы предложить главе государства прогуляться еще в нескольких местах.

**Первым пунктом его маршрута могла бы стать автозаправка. Любая.** Думаем, там главе государства будет небезынтересно узнать, что белорусские водители покупают бензин по самым высоким в СНГ ценам — аж 2870 рублей за А-92! «Явно кто-то наживается!» — обязательно должен воскликнуть Лукашенко, узнав, что с начала года топливо подорожало уже на 17%.

**Далее мы бы порекомендовали главе государства заглянуть в продуктовый магазин.** И удивиться, что с начала года сахар подорожал на 27,8%. Советуем также обратить внимание на картофель (+17,3% к декабрю), растительное и сливочное масло (+6,9% и +5,7% соответственно) и фрукты (+12,1% с начала года). Неплохо бы еще разобраться, почему белорусские помидоры стоят дороже импортных.

**Следующим пунктом маршрута должен стать какой-нибудь ГУМ или ЦУМ.** Наверное, Лукашенко будет любопытно узнать, что его соотечественники могут себе позволить покупать одежду в несколько раз дороже, чем в Литве. Вернее, не столько могут, сколько вынуждены, поскольку цены на отечественную одежду и обувь существенно выше европейских. И когда в том же Вильнюсе на распродажах можно купить майки за 10-20 тыс. руб. (в пересчете на литы), платья — за 20-50 тыс. руб., обувь — за 30-100 тыс. руб., белорусские модницы отдают за блузки — от 60 тысяч, платья — 240 тысяч рублей, юбки — 100 тысяч, босоножки — вообще полмиллиона!

Про качество мы скромно умолчим. Тем более что о нем Александр Лукашенко знает не понаслышке. В 2008 году ему даже посчастливилось примерить «коминтерновский» пиджачок. Вот его впечатления: «Ну? (Снимает свой пиджак и примеряет отечественный). Вот ты говоришь (обращается к директору швейной фабрики) 58-й размер на 188 рост. (Трогает карманы, выпячивает пиджак на животе). Телевидение снимает — страшно будет смотреть на это...». И это Александр Григорьевич еще ценник не видел!

**Чтобы быть поближе к народу, можно по дороге заглянуть на те же «Ждановичи»** — прицениться к китайскому ширпотребу, в котором наши соотечественники пытаются найти альтернативу отечественному легпрому. Только не стоит после этого сразу разрывать дипломатические отношения с Китаем. Дело тут не в китайцах, которые не хотят шить для нас по дешевке, а в белорусских налогах и арендной плате, которые предприниматели вынуждены включать в стоимость товара.

**Чтобы несколько успокоить нервишки, советуем заскочить в аптеку.** Хотя нынешняя стоимость успокоительных может, пожалуй, произвести обратный эффект. Тем более что с начала года цена на медикаменты выросла на 6,8%. И уж не обессудьте, если белорусский аналог импортного препарата окажется неэффективным.

**Дабы прогулка не оказалась утомительной, рекомендуем Александру Григорьевичу воспользоваться транспортом. Желательно общественным и хорошо бы в часпик.** Интересно, покажется ли президенту дорогой одна поездка в 700 рублей (почти три выстрела в новом тире)? Кстати, городской транспорт с начала года подорожал уже на 19,1%. Удобства при этом не прибавилось. Но зато это отличное место почувствовать в час-пик реальную сплоченность белорусского народа.

**Ну и напоследок заглянем в детский сад.** Это такое место, где коротают время дети, чьи папы не могут брать их с собой на работу. С начала года услуги детсадов подорожали на 10,8%. Понятное дело, что мало какой родитель откажется платить за комфорт собственного чада. Вот только на самом комфорте это повышение никак не отразилось: малыши, как ели макароны да каши, так и по сей день дают прирост исключительно за счет углеводов.

Есть еще множество мест, которые с нетерпением ждут появления Александра Григорьевича. Не случайно же врачи говорят о пользе прогулок.

**Анастасия Зеленкова.**

# У КОЖНАГА ЧАЛАВЕКА ЁСЬЦЬ СВОЙ БЫКАЎ

19 чэрвеня, у дзень народзінаў Васіля Быкава, у Дзяржаўным музэі гісторыі беларускай літаратуры ў Менску адбылася прэзэнтацыя аўдыёкнігі Быкава «Доўгая дарога дадому», якая выйшла ў сэрыі «Бібліятэка Свабоды. XXI стагодзьдзе». Кніга ўспамінаў Васіля Быкава «Доўгая дарога дадому» гучыць у аўтарскім выкананьні. Запіс зроблены восем гадоў таму ў Празе ў студыі Радыё Свабода. На менскую прэзэнтацыю аўдыёкнігі прыйшло каля ста чалавек. Гэта ўжо трэцяя па ліку прэзэнтацыя дыска. Першая адбылася ў Горадні, другая – у Бабруйску.

У Дзяржаўным музэі гісторыі беларускай літаратуры ў асобным пакоі аформілі адмысловую экспазыцыю пра **Васіля Быкава,** на якой разьмясьціліся рукапісы, малюнкі, кнігі, фатаграфіі і асабістыя рэчы пісьменьніка. Экспазыцыю ўпрыгожылі вялікі фотапартрэт і скульптура Быкава.




Менскую прэзэнтацыю аўдыёкнігі «Доўгая дарога дадому» адкрыў паэт **Міхась Скобла:**

«Аўдыёкнігі – зараз модны жанр. Часам сэнс таго ці іншага слова можна знайсьці толькі праз прамоўленае, праз інтанацыю, праз націск.... Часам пісьменьнікаў трэба не толькі чытаць, а і слухаць. І вось гэтую шчасьлівую магчымасьць нам дае Радыё Свабода. Многія слухалі голас Быкава ў эфіры, а зараз выйшла аўдыёкніга «Васіль Быкаў. Доўгая дарога дадому».

Ініцыятар і куратар праекта, дырэктар Беларускай службы Радыё Свабода **Аляксандар Лукашук** заявіў, што ў кожнага чалавека ёсьць свой Быкаў:

«Ёсьць свой Быкаў у **Франака Вячоркі,** які выстаяў, не зламаўся ў супрацьстаяньні з тупой сілай рэжыму. Свой Быкаў ёсьць у маладых амэрыканскіх салдат, якія зараз вяртаюцца на радзіму з палёў Аўганістану, Іраку.

На гэтым тыдні выйшла аповесьць Быкава «Мёртвым не баліць» у перакладзе на ангельскую мову. Учора **Сяргей Навумчык** узяў інтэрв'ю у перакладчыка **Джозэфа Мозура,** які сказаў: «Псыхалёгія героя-апавядальніка, сталага Васілевіча нагадвае перажываньні амэрыканскіх салдат, якія вярнуліся зь Іраку і Аўганістану, з сындромам пасттраўматычнага стрэсу. Сёньня ў нашых ўнівэрсытэтах вучыцца даволі шмат маладых вэтэранаў, якія, безумоўна, здольныя зразумець і спачуваць малодшаму лейтэнанту Васілевічу».

Свой Быкаў ёсьць і ў мяне. Сярод самых дарагіх рэчаў, якія я маю ў жыцьці, гэта словы ягонай прадмовы да маёй першай кнігі, напісанай больш за 20 гадоў таму, якія ён потым уключыў у свой збор твораў, гэта лісты, якія пачыналіся словамі: «Саша, дарагі дружа...» Гэта сустрэчы ў гасьціннай кватэры **Ірыны Міхайлаўны і Васіля Ўладзімеравіча,** прагулкі па праскіх вуліцах...

Калі гаварыць на тэму «Быкаў і Свабода», трэба гаварыць пра чатырох Быкавых. **Быкаў першы – Быкаў-слухач.** Быкаў пачаў слухаць замежнае радыё, як ён сам пра гэта расказвае, у 50-я гады. Калі зьявіліся ў яго першыя прымачы, ён настройваўся на «Свабоду», на ВВС, на «Голас Амэрыкі». Ён даў нам хіба самую вялікую ацэнку і пашану: «Надвячоркам кожнага дня я ўключаю прыймач і шукаю Свабоду. Тое сталася звычкай і патрэбай душы...»

**Другі Быкаў – Быкаў-герой Свабоды.** Радыё Свабода расказвала, камэнтавала, аналізавала ягоныя творы. Кніга «Мёртвым не баліць» была апублікаваная ў Мюнхэне супрацоўнікамі Беларускай службы Радыё Свабода ў 1967 годзе. Ягоныя прамовы на зьездах пісьменьнікаў, ягоныя публікацыі ў маскоўскім друку вярталіся да слухачоў Беларусі вельмі часта праз Радыё Свабода. Свабода расказвала пра яго ролю ў стварэньні Беларускага Народнага Фронту, «Мартыралёга Беларусі», Беларускага ПЭН-цэнтру.

**Трэці Быкаў – гэта Быкаў-удзельнік перадачаў.** Нам як журналістам было вельмі лёгка працаваць з Быкавым. Я не прыпомню ніводнага выпадку, калі б Быкаў адмовіўся даць інтэрв'ю, калі ён не пагадзіўся на ўдзел у перадачы... Зьмест гэтых інтэрв'ю, выступаў склаў каля 500 старонак кнігі «Быкаў на Свабодзе».

**І чацьвёрты Быкаў – гэта аўтар Свабоды.** Калі Быкаў зь Ірынай Міхайлаўнай быў вымушаны зьехаць зь Беларусі ў Фінляндыю, калі пачаўся іх вандроўны пэрыяд жыцьця, у рэдакцыю пачалі прыходзіць лісты ад Васіля Ўладзімеравіча. Вельмі часта я атрымліваў канвэрт, у якім ляжалі тэксты прыпавесьцяў, апавяданьняў, аповесьцяў. Кожны раз яны суправаджаліся прыпіскай: «Калі я вам ужо надакучыў, ня трэба, не чытайце...» І гэтыя творы чыталі журналісты. І з гэтым чацьвёртым Быкавым, аўтарам Свабоды, мы не раз вялі гаворку пра ягоныя ўспаміны, пра мэмуары... Аднойчы ў тэлефоннай размове, калі ён жыў у Франкфурце, ён сказаў, што нешта напісаў». Мы зь вялікім энтузіязмам сталі прасіць яго прыслаць гэта. І калі ўспаміны былі завершаныя, ён паабяцаў прыслаць. І даслаў.

Адразу стала ясна, што гэты тэкст, гэты твор ня могуць чытаць журналісты, ня могуць чытаць дыктары. Гэтыя словы павінны быць агучаныя самім аўтарам. Васіль Уладзімеравіч не пагадзіўся: маўляў, у вас добрыя галасы... Але мы не здаваліся, навучаныя быкаўскай прозай, настойвалі. І ўрэшце рэшт удалося яго пераканаць прыехаць у Прагу».

Пісьменьнік **Уладзімер Арлоў** паведаміў, што ён цяпер піша працяг сваёй дзіцячай кнігі «Адкуль наш род», якая будзе даведзеная да нашых дзён. «Сярод герояў будуць нашы сучасьнікі. І адно з апавяданьняў будзе прысьвечанае Васілю Быкаву. Быкаву быў прысьвечаны і разьдзел іншай маёй кнігі «Імёны Свабоды»: «Сапраўднае адкрыцьцё Быкава як пісьменьніка глыбока нацыянальнага пачалося для мяне пасьля зьяўленьня аповесьці «Знак бяды». Васіль Уладзімеравіч ня раз казаў, што яму блізкі экзыстэнцыялізм, асабліва раман Альбэра Камю «Чума». Адрозна ад францускага калегі, Быкаў, нягледзячы на моцную падтрымку Вацлава Гаўла і Чэслава Мілаша, ня быў уганараваны Нобэлеўскай прэміяй. Але ці была гэтая ўзнагарода зь яе сёньняшнім пахіснутым аўтарытэтам варта Быкава?.. У нашай апошняй размове Быкаў паўтарыў фінальныя словы сваёй «Доўгай дарогі дадому»: «Мой лёс пэсымістычны, хаця душа мая прагне аптымізму».

Старшыня Саюзу беларускіх пісьменьнікаў **Алесь Пашкевіч** распавёў, што 8 з 14 тамоў з поўнага збору твораў Быкава ўжо выдадзеныя: «Сёлета зьявяцца наступныя 9 і 10 тамы поўнага збору твораў Васіля Быкава, куды ўвойдуць усе вядомыя п'есы, драматургічныя тэксты, а таксама ўсе сцэнары, якія ён аўтарызаваў».

Вядоўца імпрэзы, паэт **Міхась Скобла** згадаў: «У 1963 годзе Быкаў, літаратурны кансультант «Гродзенскай праўды» пісаў у лістах ў Зэльву да **Ларысы Геніюш:** «Ганаруся вашай «залатой жылачкай». Друкаваў вершы на старонках газэты. І гэта для апальнай паэткі было вялікай падтрымкай. Вось гэтай падтрымкі нам вось як бы ад Васіля Быкава бракуе, але ў той жа час яна ёсьць. Яна ёсць у ягоных творах, яна ёсьць у ягоным голасе, яна ёсьць у ягоных інтанацыях. І каб беспамылкова пазнаць прыпіску Васіля Быкава, слухайце яго «Доўгую дарогу дадому», якую выдала Беларуская служба Радыё Свабода».

На дыску, акрамя аўдыёкнігі з голасам Васіля Быкава, зьмешчаныя тэкст самой кнігі «Доўгая дарога дадому», ягоныя нататкі «Парадоксы жыцьця», далітаратурная біяграфія «Пункціры жыцьця», а таксама ўся Бібліятэка Свабоды.

**Іна Студзінская.**

**Ад рэдакцыі:** Аўдыёкнігу магчыма замовіць бясплатна напісаўшы заяўку на "Радыё Свабода": 220005, Менск, паштовая скрынка 111.

# «Шануйце ж мову нашую, беларускую…»

***У апошні час падняўся традыцыйны шум вакол кампаніі "Говори правду" і чарговых людзей, якім далі рэсурсы на выбары ці, па сутнасьці, – на легітымізацыю рэжыму (хто даў – ня мае значэньня, бо патэнцыйныя спонсары два: маскоўцы і немцы і для Беларусі гэта "адзін чорт" – чые грошы, таго й праўда). Людзі абзавяліся тэхнікай, офісамі, кампутарамі, тэлефонамі, пачалі даваць інтэрв'ю, шумець (усё па наезджанай дарожцы).***

**Інтэрмедыя**

І тады, калі ўсё было ўжо ў камплекце, як заўсёды на іх наскочыла міліцыя і КГБ. Забралі тэхніку, офісы, кампутары, тэлефоны, грошы (нават пярсьцёнкі і ўпрыгожваньні спрабавалі рэквізаваць пад выглядам ператруса). Фігурантаў маёмасьці адвезьлі пад арышт, пратрымалі тры дні і выпусьцілі. За гэты час так званыя "незалежныя" СМІ з свайго боку ўшчалі "кампанію галоснасьці": бралі інтэрв'ю ў жонак фігурантаў, міліцыянераў, юрыстаў, вядомых дзеячоў, якія абураліся беззаконьнем улады і г. д.

Фігуранты вышлі з арышту і сказалі, што іх не запалохаць і што калі да гэтага, маўляў, пра іхнюю справу ніхто ня ведаў, то цяпер ведаюць усе, улада сама сабе зрабіла горай і г. д. На гэтым заіграны спэктакль скончыўся (дакладней, інтэрмэдыя спэктакля). Усе засталіся пры сваёй выгадзе: міліцыя пры кампутарах, лаптопах, прынтэрах і т. п., фігуранты пры рэкламе, а ўлада пры сіле. Толькі выбаршчыкі павінны б былі застацца ў дурнях.

Але... хто яго ведае. Выбаршчык ужо зьмяніўся і шмат што стаў разумець. У Марка Твэна, як памятаем, у актораў прагарэлага тэатра кідалі здохлым катом. Беларусы, мяркую, катом кідацца ня будуць, але на рэжымныя выбары наўрад ці пойдуць (і правільна зробяць, нават калі б акцёры, як у Твэна, распрануліся да гала).

Зрэшты, яны і так ужо распрануліся дастаткова. Нібыта"апазыцыйны"палітычны тэатр даўно замкнуўся на адных і тых жа выканаўцах. І калі рыхтуецца нешта як бы новае, "рэвалюцыйнае" і т. п. (са старым ці сьвежым спонсарам), тады варта толькі паглядзець склад трупы. І калі заўважым там такія прозьвішчы, як, скажам, спадар Фядута і спадарыня Процька, – затыкайма нос і ўцякайма хутчэй. Маўляў, усё зь імі зразумела і хай не хаваюцца за плечы паэта Някляева. Бо ніякай "праўды" там няма, нічога шчырага і нічога беларускага. Гэта вядомыя спажыўцы чужых рэсурсаў і выканаўцы чужых заказаў (і, адпаведна, чужой палітыкі).

**Каляніялізм і адраджэньне**

У самы разгар незразумелай для некаторых акцыі з ператрусам, рэквізіцыяй і арыштамі радыё Свабода брала інтэрв'ю ў спадарыні Процькі (яе не арыштоўвалі і вобыску не рабілі). *"Чаму па-беларуску не друкавалі ўлёткі?"* – пытаюцца. І Процька адказвае: *"Мы зьвяртаемся да насельніцтва, якое размаўляе па-расейску, на расейскай мове. Лепей зьвяртацца на той мове, якую яно разумее, на якой яно будзе пісаць, на якой ня будзе адчуваць сябе непаўнавартасным. Але я хачу адказаць спадару Трусаву вось як. На жаль, у нас у Беларусі беларуская мова – гэта ня проста сродак камунікацыі, як ва ўсіх краінах. Яна у нас – палітычная картка, якую чалавек выстаўляе грамадзтву. Гэта зрабіла ў свой час адна палітычная сіла, яна прыватызавала мову, і на сёньняшні дзень той, хто размаўляе па-беларуску – спытай любога ў нашай вёсцы – гэта бэнэфавец. Чаму так атрымалася? Цяпер можна гэта аналізаваць, але мы ў рэальнай сытуацыі. І калі мы ў рэальнай сытуацыі хочам нешта зрабіць з грамадзтвам, каб яно стала эўрапейскім, увабрала ў сябе і зрабіла нормамі свайго існаваньня і жыцьця сучасныя дэмакратычныя стандарты, мы павінны зыходзіць з тых умоваў і стандартаў, якія мы маем, а не якія мы хацелі б мець. Калі насельніцтва гаворыць па-расейску, калі беларуская мова ўспрымаецца як прыкмета пэўнай палітычнай сілы, і калі гэтая палітычная сіла з тых ці іншых прычын непапулярная, страціла для насельніцтва свае прывабныя якасьці, а мы хочам дасягнуць нейкі вынік ад кампаніі «Гавары праўду», мы карыстаемся тым, што найлепш нас прывядзе да гэтага выніку".*

Вось гэта і ёсьць антыбеларуская антымоўная прапаганда, прыдуманая рознымі канторамі і палітычнымі спонсарамі. Такое мы чулі ўжо ад фраў Рабіц, Бэніты Вальднэр, гэра Ганса Віка, фраў Цапф, гэра Фрыка ды іншых гэраў (калі сягаць глыбей, то яшчэ ад генэрала СС Курта фон Готбэрга). Русіфікатарам заставалася толькі паўтараць нямецкія фармулёўкі.

Тут тыповае выяўленьне каляніяльнай пазыцыі "статус-кво", якая зыходзіць з кансэрвацыі разбуральных вынікаў каляніяльнай палітыкі і сцьвярджэньня іх як нормы жыцьця.

Альтэрнатывай каляніяльнай палітыцы "статус-кво" ёсьць пазыцыя нацыянальнага Адраджэньня, якое ставіць задачу ліквідацыі каляніяльнай палітыкі і аднаўленьня (адраджэньня) усяго таго, што было разбурана, зглумлена, украдзена, сфальсіфікавана і перайначана каляніяльнымі (акупацыйнымі) уладамі.

У апраўданьне антыбеларускай палітыкі рэжым прыдумвае небыліцы. Напрыклад, што пры "нацыяналістах" у 90-х усе рускія "сядзелі на чамаданах на вакзале". Гэта тыповая гёбэльсаўшчына, нічога падобнага ў прыродзе не існавала. Альбо іншая небыліца (якую агентура часта паўтарае), што насільна ўводзілі беларускія школы і беларускую мову, што на мове размаўлялі толькі "бэнэфоўцы" і гэтак далей і да таго падобная прапагандысцкая лухта.

Не было ніякіх "чамаданаў", ніхто "насільна" не адчыняў школы. Беларускі народ, мову якога саветы пазбавілі афіцыйнага ўжытку, на справе зь вялікай павагай адносіўся да сваёй мовы. І як толькі прыняты быў закон і зьнікла фактычная забарона на мову і на школу – усё пайшло лёгка, амаль што само сабой. Самыя чыноўнікі спрыялі гэтаму добраму працэсу. Людзі хораша спаткалі незалежнасьць і паверылі, што будзе сапраўдная Беларуская дзяржава, і што трэба вучыць дзяцей і вяртаць сваю мову ў афіцыйны ўжытак.

Да мяне на дэпутацкі прыём прыходзілі расейцы, што жывуць у Беларусі, і казалі аб падтрымцы, і што яны аддалі сваіх дзяцей у беларускую школу.

Гэтак будзе і тады, калі абваліцца антыбеларускі рэжым Лукашэнкі, разам са сваёй "апазыцыяй". (А яны абваляцца).

Цікава, што галоўныя прапагандысцкія прыдумкі прысутнічаюць тут у адным антымоўным выказваньні Процькі (толькі пра "большасьць насельніцтва" – гэта нямецкі прадукт).

За 70 гадоў рэпрэсіяў, нішчэньня і дэфармацыі беларускага грамадзтва афіцыйная моўная сытуацыя была зрусіфікаваная. Гэтую русіфікацыю за саветамі аб'явілі як "норму" і ўключылі ў палітычную дактрыну КПСС пра "савецкі народ". Той, хто выступаў за беларускую мову, той ня ўкладваўся ў "норму", а значыць выступаў супраць гэтага "савецкага" народа (выглядаў антысавецчыкам, а гэта крымінальны артыкул і вельмі жорсткі). Так выглядала "статус-кво" за саветамі.

На барацьбу з савецкай каляніяльнай палітыкай стаў Беларускі Народны Фронт. Ён падняў беларускі Бел-Чырвона-Белы сьцяг, выступіў за адраджэньне беларускай культуры, за дзяржаўнасьць беларускай мовы, за дзяржаўную незалежнасьць Беларусі, за ліквідацыю каляніяльнай камуна-маскоўскай сістэмы, за свабоду і дэмакратыю.

Фронт выступіў адкрыта і перамог, атрымаўшы падтрымку людзей. Пад ціскам Фронту пасыпалася камуна-маскоўская акупацыя Беларусі. Упершыню за 200 гадоў мы вярнулі нашу дзяржаўную незалежнасьць, мову, сьцяг і герб на дзяржаўны пасад. Упершыню КГБ СССР атрымаў ад Фронту зубадрабільны ўдар у Курапатах і ў палітыцы незалежнасьці. Упершыню КГБ СССР пацярпеў паразу.

На жаль, пасьля 1991-га савецкая намэнклатура і КГБ здолелі захаваць сваю ўладу ў Беларусі. У канцовым выніку гэта прывяло да рэстаўрацыі антыбеларускага савецтызму і прамаскоўскай рэакцыі ў 1994 годзе, узмацніла ролю КГБ ва ўнутранай палітыцы.

Рэстаўрацыя антыбеларускага рэжыму адбывалася па тым жа каляніяльна-савецкім пляне, як і 75 гадоў таму: ліквідацыя беларускіх сымвалаў, зьнішчэньне беларускай школы, падручнікаў, выцясьненьне мовы з афіцыйнага ўжытку, палітычная рэформа правапісу, ліквідацыя беларускіх выдавецтваў, часопісаў, устаноў і г. д. – усё па схеме ўнутранай акупацыі, адпрацаванай яшчэ за часы СССР.

Пятнаццацігадовы гвалт над грамадзтвам не мінае бясьсьледна. Зьмены ў грамадзкім становішчы тут жа стараюцца (як і пры саветах) увесьці ў норму, а ўсялякае змаганьне за нармальнасьць супраць гвалту імкнуцца пазбавіць правой, аб'яўляючы маргінальным, антынародным і г. д. – усё па старой схеме "статус-кво". ...

**Зянон Пазьняк.**

**Заснавальнік і рэдактар:** Леанід Гаравы

**Адрас рэдакцыі:** 211573, г. Гарадок, вул. Гагарына, д.30Б, кв.16. E-mail: 250318@list.ru Тэл. 8-02139-4-42-52, маб. + 375(29)6723842 (V), +375(33)6969347 (МТС)

**Наклад: 290 асобнікаў.** Выдаецца пры падтрымцы сяброў. Распаўсюджваецца бясплатна